## СЁННЯ — ЮБІЛЕЙНЫ, 1000-й НУМАР НАШАЙ ГАЗЕТЫ

РЭКТАРАТ І ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ГДУ ГОРАЧА ВІНШУЮЦЬ КАЛЕКТЫЎ РЭДАКЦЫІ, УСІХ АЎТАРАЎ І ЧЫТАЧОЎ ГАЗЕТЫ "ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ" З ВЫХАДАМ У СВЕТ ЯЕ 1000-ГА НУМАРА. ЖАДАЕМ, КАБ І Ў БУДУЧЫМ ЯНА ЗАСТАВАЛАСЯ НА ЎЗРОЎНІ ВЫСОКІХ СУЧАСНЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ.

ВОСТРАГА ВАМ ПЯРА, ТВОРЧЫХ ЗНАХОДАК І ЦІКАВЫХ ПУБЛІКАЦЫЙ, ШАНОЎНЫЯ ТАВАРЫШЫ!

*РЭКТАРАТ. ПРАФКОМ. ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



*№ 7 (1000) | АЎТОРАК, 10 красавіка 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная*

## НА ЯЕ СТАРОНКАХ — ГІСТОРЫЯ ГДУ

Шаноўныя аўтары і чытачы газеты "Гомельскі універсітэт", верныя нашы сябры!

Сёння ў руках вы трымаеце і знаёміцеся з публікацыямі **1000-га нумара** сваёй шматтыражкі. Гэта своеасаблівы юбілей, сапраўднае свята не толькі цяперашняга калектыву рэдакцыі, яе грамадскіх памочнікаў, але і ўсіх тых, хто стаяў ля вытокаў універсітэцкага перыядычнага выдання, на працягу ўсіх гадоў існавання газеты ўносіў свой уклад, каб яна была больш змястоўнай і цікавай.

Для таго, каб выйшаў у свет 1000-ы нумар нашай газеты, спатрэбілася без малога 32 навучальныя гады. Гэта азначае, што за прайшоўшы перыяд супрацоўнікамі рэдакцыі і яе пазаштатнымі аўтарамі напісаны 32 тамы гісторыі другога ў Беларусі па часу свайго стварэння універсітэта. А як вядома, наша alma mater — вядучая ў рэгіёне вышэйшая навучальная, навуковая і культурна-асветніцкая ўстанова ў сваім станаўленні і развіцці мае шмат яркіх і ўзорных старонак. Таму ўсё часцей выкладчыкі, аспіранты і студэнты звяртаюцца да падшывак сваёй газеты, каб узгадаць многія падзеі і факты з мінулага ў жыцці ГДУ.

Нельга не нагадаць, што першым рэдактарам "Гомельскага універсітэта" быў малады журналіст Уладзімір Гулевіч, які па службовай лесвіцы дасягнуў значнай вышыні, але і цяпер з задавальненнем успамінае аб сваёй працы ва універсітэцкай шматтыражцы.

Нядоўгі час рэдагаваў газету Кастусь Калінаў — вялікі аматар гумару і беларускай паэзіі. Пасля яго гэтыя абавязкі некалькі месяцаў на грамадскіх пачатках выконваў загадчык кафедры філасофіі дацэнт У.С.Сідараў. Затым на пасаду рэдактара быў назначаны выпускнік аспірантуры Мікола Воінаў. На жаль, нікога з іх траіх ужо няма ў жывых.

І вось ужо больш за 28 гадоў у руля "Гомельскага універсітэта" — аўтар гэтых радкоў.

Прыемна адзначыць, што ў розныя гады з нашай шматтыражкай плённа супрацоўнічалі многія студэнты, якія затым сталі вядомымі паэтамі і празаікамі, вучонымі. Сярод іх — члены Саюза пісьменнікаў Беларусі дацэнты Віктар Ярац з кафедры беларускай літаратуры, Іван Афанасьеў — з кафедры рускай літаратуры, Ніна Шклярава, Таіса Мельчанка, Міхась Башлакоў, Вольга Куртаніч, Ларыса Раманава, Ірына Багдановіч, Анатоль Зэкаў, Анатоль Сыс і іншыя прызнаныя паэты і празаікі.

Можна нагадаць шмат імёнаў былых студэнтаў, якія ў гады вучобы актыўна друкаваліся на старонках "Гомельскага універсітэта" і аддалі перавагу не набытай, а журналісцкай прафесіі. Гэта былы яе супрацоўнік, а цяпер намеснік рэдактара абласной газеты "Мінская праўда" Алег Шведаў, педагог па адукацыі, а зараз першы намеснік рэдактара "Гомельскай праўды" Мікалай Новік, галоўны рэдактар гарадской газеты "Гомельские ведомости", фізік па адукацыі Мікалай Дзямчыхін, нядаўняя выпускніца матэматычнага факультэта, а ўжо карэспандэнт "Советской Белоруссии" па Гомельскай вобласці Ірына Такоева. Многія з тых, хто прайшоў пачатковую журналісцкую школу пры нашай газеце, з дыпломам ГДУ плённа працуюць у сродках масавай інфармацыі не толькі Гомельшчыны, але і нашай краіны.

Выхад у свет 1000-га нумара "Гомельскага універсітэта" — гэта пара сталасці нашай газеты. На яе працяглым шляху былі не толькі поспехі, але і прабелы. Хочацца, каб недахопаў станавілася ўсё менш і менш. Таму мы зацікаўлены, каб нашы аўтары, чытачы не толькі дапамагалі сваімі допісамі, але і выказвалі ўласныя пажаданні, уносілі канкрэтныя прапановы, як палепшыць універсітэцкую шматтыражку. Якія для гэтага неабходна асвятляць тэмы і ўвесці новыя рубрыкі, як палепшыць паліграфічнае афармленне? Думаецца, што з цягам часу тут сваё слова будуць выказваць студэнты беларускага аддзялення філалагічнага факультэта, якія сваёй спецыялізацыяй абралі журналістыку.

Сёлета мы ўступілі ў новае XXI стагоддзе і трэцяе тысячагоддзе. І сімвалічна, што наша газета павядзе адлік на двухтысячную лічбу. Калектыў рэдакцыі будзе рабіць усё магчымае, каб сваю газету ў кожным універсітэцкім падраздзяленні чакалі з нецярплівасцю і чыталі з цікавасцю.

**Уладзімір БАЛОГА, рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт", член Беларускага саюза журналістаў.**

<u>З абласнога семінара</u>

## КАЛЕКТЫЎНЫМ ДАГАВОРАМ – ПРАВАВУЮ АСНОВУ

На базе нашага універсітэта Гомельскай абласной арганізацыяй Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі праведзены семінар старшынь прафкомаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, студэнцкай і вучнёўскай моладзі навучальных устаноў "Прававая аснова заключэння калектыўных дагавораў".

У ім прынялі ўдзел кіраўнікі прафсаюзных арганізацый вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў абласнога цэнтра, Мазыра, Светлагорска, Рэчыцы, Рагачова, Лоева.

Перад удзельнікамі семінара выступіў рэктар ГДУ, прафесар, член Савета Рэспублікі М.В.Селькін, які расказаў гасцям аб нашай ВНУ, адзначыўшы пры гэтым яе высокі рэйтынг у Беларусі. Міхаіл Васільевіч засярodзіў увагу на тых добрых, плённых узаемаадносінах, якія склаліся паміж прафсаюзнымі камітэтамі і кіраўніцтвам ГДУ ў вырашэнні надзённых праблем і задач.

У нас накоплены багаты вопыт прафсаюзнай работы па пытанню, вынесенаму на абмеркаванне ўдзельнікаў семінара. З ім іх знаёмілі старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі і старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава. Яны падрабязна расказалі аб практыцы заключэння Калектыўнага дагавора і Пагаднення паміж рэктаратам і прафкомам студэнтаў, якія абараняюць правы і інтарэсы выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнцтва.

Начальнік планава-фінансавага аддзела С.Я.Пашук азнаёміла ўдзельнікаў семінара з работай адміністрацыі і прафкома па матэрыяльнаму стымуляванню работнікаў ГДУ. Шмат карыснай інфармацыі аб ажыццяўленні грамадскага кантролю за захаваннем заканадаўства аб працы і заработнай плаце, ахове працы, значэнні Калектыўнага дагавора ў вырашэнні гэтых пытанняў, арганізацыі культурнага адпачынку членаў універсітэцкага калектыву атрымалі прафсаюзныя работнікі з выступленняў старшынь камісій прафкома ГДУ А.Р.Рыбальчанкі, А.М.Семянкова, В.В.Лісоўскага.

На семінары адбыўся абмен вопытам работы аб практыцы сацыяльнага партнёрства, у якім прынялі ўдзел старшыні прафкомаў: Інстытута механікі металапалімерных сістэм НАН РБ С.В.Фядорка, Лоеўскага педвучылішча — М.Я.Бутанаў, Гомельскага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога — І.А.Сабаленка.

Аб задачах па ўдасканальванню сацыяльнага партнёрства ў святле дзеючага ў Рэспубліцы Беларусь заканадаўства ўдзельнікам семінара расказалі нам. старшыні абкома прафсаюза Н.І.Аліфірэнка і загадчыца аддзела абкома прафсаюза В.В.Грэмяшкевіч.

Падводзячы вынікі семінара, старшыня абкома галіновага прафсаюза У.Я.Курылаў адзначыў важнасць і актуальнасць абмеркаваных на ім пытанняў. У сённяшніх складаных умовах жыцця Калектыўны дагавор, заключаны на прававой аснове, можа абараніць правы і інтарэсы працуючага чалавека.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

<u>З успамінаў першага рэдактара</u>

## ДЛЯ МЯНЕ ТОЙ ГОД ЗАСТАЎСЯ НЕЗАБЫЎНЫМ

***Першым рэдактарам універсітэцкай шматтыражкі быў гамяльчанін Уладзімір Гулевіч. Праз год ён узначаліў рэдакцыю Хойніцкай раённай газеты "Ленінскі сцяг". З 1977г. ён вучыўся ў Мінскай вышэйшай партыйнай школе. Яшчэ ў час вучобы ў ВПШ быў зацверджаны загадчыкам аддзела прапаганды газеты "Советская Белоруссия". Затым амаль тры гады працаваў памочнікам Старшыні Савета Міністраў БССР А.М.Аксёнава.***

***Пэўны час Уладзімір Міхайлавіч з'яўляўся намеснікам дырэктара Беларускага тэлеграфнага агенцтва. Цяпер ён узначальвае прэс-цэнтр пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.***

Было гэта ў ліпені 1969 года. Мяне, маладога журналіста, адказнага сакратара гомельскай раённай газеты "Маяк", паклікалі ажно ў абласны камітэт партыі, у сектар друку. Вось тады я, як кажуць, на ўласнай скуры адчуў, што адкрыццё Гомельскага дзяржаўнага універсітэта — не проста навіна, а суровая рэальнасць. Суровая, бо мне прапанавалі пасаду рэдактара універсітэцкай шматтыражнай газеты.

І вось іду да рэктара ствараемага універсітэта вядомага вучонага Уладзіміра Аляксеевіча Белага. Не ведаю, як была ўспрынята мая асоба, а на мяне ён зрабіў моцнае ўражанне.

Рэктар увесь час трымаў газету ў полі свайго зроку, бо добра разумеў, што без яе цяжка згуртаваць прафесарска-выкладчыцкі калектыў, зрабіць студэнцкае жыццё цікавым і разнастайным.

У.В.Белы выслухаў мае прапановы па стварэнню першага нумара шматтыражкі, якую назвалі проста — "Гомельскі універсітэт". Дамовіліся, што газета раскажа пра ўсе факультэты.

Наогул, трэба было давесці да чытача, што ж гэта такое — новая навучальная ўстанова, чым яна будзе займацца, каго стане рыхтаваць, хто ў ёй будзе працаваць. У.А.Беламу асабліва важна было падкрэсліць высокую кваліфікацыю выкладчыцкіх кадраў, сярод якіх набралася нямала дактароў і кандыдатаў навук, прафесараў, дацэнтаў. Хацелася, каб усе ў краіне адразу ж зразумелі, што ГДУ — прэстыжная ВНУ.

Прыемна было, што і сам рэктар згадзіўся выступіць з артыкулам. Прынамсі, ён патрабаваў ад усіх выкладчыкаў і службовых універсітэцкіх асоб рэгулярна пісаць у сваю газету, каб было ўсім бачна, хто над чым і як працуе.

Здаецца, я тады быў здольны на ўсё, мог нават сам, калі б запатрабавалася, набраць уручную, звярстаць і аддрукаваць нумар. Гэта сёння, з вышыні прайшоўшага больш чым 30-годдзя і набытага жыццёвага

**(ЗАКАНЧЭННЕ на 2-й стар.)**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За эфектыўную работу па падрыхтоўцы спецыялістаў па фізічнай культуры, укараненню фізічнай культуры і спорту ў паўсядзённае жыццё навучэнцаў і студэнтаў, актыўную плённую працу па падрыхтоўцы спартсменаў высокага класа і навуковую дзейнасць і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту МІХАЛЕНЯ Валерый Маркавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры эканамічных тэорый ВЕТЛУГАЕЎ Генадзь Дзмітрыевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін ЕЎТУХОВА Ларыса Аляксандраўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

*За шматгадовую плённую працоўную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта камендант вучэбных карпусоў №№ 2, 3 ЧАПУРНАЯ Вера Іванаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

## ВІНШУЕМ!

*Рашэннем Прэзідыума БелВАКа **КАВАЛЬЧУК** Вікторыі Валер'еўне і **МІНЧАНКА** Вользе Аляксандраўне з кафедры бухуліку, кантролю і АГД, **ВОІНАВАЙ** Алене Мікалаеўне з кафедры беларускай мовы прысвоена вучонае званне дацэнта па адпаведных спецыяльнасцях.*

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМ. Ф.СКОРИНЫ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ СТУДЕНТОВ НА I КУРС ЗАОЧНОГО ОТДЕЛЕНИЯ НА 2001 ГОД

1. В университет принимаются граждане Республики Беларусь и белорусы, проживающие за её пределами, граждане Российской Федерации, Республики Казахстан, Киргизской Республики, Республики Таджикистан, лица, постоянно проживающие на территории республики или имеющие статус беженца.

Указанные категории лиц имеют право получить в университете на базе среднего образования на конкурсной основе бесплатное высшее образование, если образование данного уровня получается впервые.

Граждане других зарубежных стран принимаются в университет на основе межгосударственных соглашений или договоров с оплатой обучения.

2. **Приём заявлений с 14 мая по 14 июня. Вступительные экзамены с 18 июня по 30 июня. Зачисление** в состав студентов: по плану — **до 5 июля**, на условиях оплаты обучения — **до 25 августа.**

3. Поступающие в университет подают в приёмную комиссию или присылают следующие документы:

— заявление установленного образца на имя ректора;

— документ государственного образца о среднем образовании в оригинале либо нотариально заверенная копия или заверенная ксерокопия (ксерокопия заверяется приемной комиссией по представленному оригиналу);

— сертификат централизованного тестирования в оригинале либо нотариально заверенная копия или заверенная ксерокопия для тех, кто прошел централизованное тестирование и поступает на специальность "Автоматизированные системы обработки информации" (ксерокопия заверяется приемной комиссией по представленному оригиналу);

— медицинская справка по форме 086У;

— выписка из трудовой книжки (для тех, кто работает);

— справка из службы занятости населения (для тех, кто находится на её учёте);

— 6 фотографий размером 3х4.

Одновременно представляются документы, которые подтверждают право абитуриентов на льготы, установленные законодательством Республики Беларусь, или свидетельствуют о личных талантах и способностях абитуриентов.

Абитуриенты, поступающие не в год получения среднего образования, обязаны представить документы, которые подтверждают их работу или учёбу за годы, предшествующие поступлению (диплом, выписку из трудовой книжки, справку из службы занятости населения и др.).

Паспорт или другое свидетельство личности, выданное органами МВД Республики Беларусь, предъявляются в приёмную комиссию абитуриентом лично.

4. Университет осуществляет приём студентов сверх плана приёма на условиях договоров с оплатой обучения юридическими или физическими лицами. На места сверх плана приёма, количество которых определяется приемной комиссией, на конкурсной основе зачисляются:

— абитуриенты, которые положительно сдали вступительные экзамены, но не прошли по конкурсу в университет;

— абитуриенты, которые имеют направления предприятий (организаций) и положительно прошли собеседование по предметам вступительных экзаменов.

**Собеседование** проводится **с 21 по 22 августа. Приём заявлений** от абитуриентов, поступающих в университет на условиях договоров с оплатой обучения, осуществляется **с 7 по 16 августа.**

5. Все вступительные экзамены, за исключением экзамена по белорусскому или русскому языку и литературе для поступающих на нефилологические специальности, являются конкурсными. Они (кроме экзамена по спецфизподготовке) проводятся по программам, которые составлены в соответствии с учебными программами средней общеобразовательной школы (базовый уровень) и утверждены Министерством образования Республики Беларусь. Экзамены проводятся с оценкой знаний по шестибальной системе (2; 3; 3,5; 4; 4,5; 5). На специальности "Русский язык и литература" и "Белорусский язык и литература" все экзамены — конкурсные, а на остальные специальности экзамен, указанный в перечне последним — неконкурсный.

6. Для всех абитуриентов обязательным является письменный вступительный экзамен по белорусскому или русскому языку.

Экзамен по иностранному языку абитуриенты могут сдавать на выбор, независимо от того, какой иностранный язык они изучали в среднем учебном заведении. Абитуриентам, которые постоянно проживают не менее двух лет в сельских населенных пунктах или на территориях, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС и окончили общеобразовательные учебные заведения, а также профессионально-технические учебные заведения сельскохозяйственного профиля, которые размещены в этих населенных пунктах, разрешается вместо вступительного экзамена по иностранному языку сдавать вступительный экзамен по белорусскому языку, если обязательный экзамен они сдают по русскому языку, или по русскому языку, если обязательный экзамен они сдают по белорусскому языку.

7. Абитуриенты, которые не явились на экзамен без уважительных причин или получили неудовлетворительную оценку, а также которые забрали документы, к дальнейшим экзаменам не допускаются.

Отсутствие абитуриента на вступительном экзамене в связи с поступлением в другие вузы или на другие специальности уважительной причиной не является.

8. Апелляции по вопросам экзаменационных оценок подаются ответственному секретарю приёмной комиссии на имя ректора в день проведения устного экзамена или в день объявления оценки по письменному экзамену. Повторная сдача экзамена не разрешается.

9. Зачисление проводится среди лиц, которые представили **до 1 июля 2001 года** в приемную комиссию оригиналы документа государственного образца о среднем образовании и сертификата централизованного тестирования (для тех, кто прошел централизованное тестирование и поступает на специальность "Автоматизированные системы обработки информации").

10. Зачисление в университет проводится по конкурсу. В первую очередь зачисляются абитуриенты, имеющие среднее специальное или профессионально-техническое образование, или работают не менее шести месяцев и поступают на соответствующие или родственные специальности. Конкурс проводится по специальностям.

**Другие лица, имеющие одинаковый или высший балл, зачисляются в пределах 20% от контрольных цифр приёма по данной специальности.**

При приёме на специальности "Автоматизированные системы обработки информации" засчитываются результаты централизованного тестирования в соответствии с представленным государственным сертификатом.

11. Абитуриенты, которые прошли довузовскую подготовку, поступают на общих основаниях.

**Совмещенные выпускные и вступительные экзамены для слушателей подготовительного отделения ГГУ им.Ф.Скорины** проводятся для лиц, которые постоянно проживают не менее двух лет в сельских населенных пунктах или на территориях, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС и окончили общеобразовательные учебные заведения, которые размещены в этих населенных пунктах, в срок **с 18 по 30 июня.** С результатами совмещенных экзаменов они могут участвовать в общем конкурсе.

Лица, которые прошли обучение через другие формы довузовской подготовки при университете, зачисляются на общих основаниях.

12. Лица, закончившие среднее общеобразовательное учебное заведение с медалью, среднее специальное учебное заведение или ПТУ (на основе базовой школы с получением среднего образования) с дипломом с отличием, сдают все вступительные экзамены и участвуют в общем конкурсе.

13. Вне конкурса при получении положительных оценок на вступительных экзаменах зачисляются:

— воины-интернационалисты;

— дети-сироты и дети, оставшиеся без опеки родителей;

— дети из семей военнослужащих или рабочих и служащих, которые занимали штатные должности в воинских частях, погибших (умерших) или ставших инвалидами во время прохождения воинской службы или работы в составе советских войск на территории государств, где велись боевые действия, а также дети из семей военнослужащих, погибших (умерших) в мирное время при прохождении воинской службы;

— дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов внутренних дел, погибших (умерших) или ставших инвалидами при исполнении служебных обязанностей на территории государств, где велись боевые действия, а также погибших (умерших) в мирное время при исполнении служебных обязанностей;

— инвалиды I и II групп, а также дети-инвалиды, которым в соответствии с заключением медико-реабилитационных экспертных комиссий не противопоказано обучение в вузе и которые могут посещать занятия;

— лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.18 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС". Абитуриенты этой категории, которые закончили учебные заведения с отличием (с отличными оценками), зачисляются по результатам собеседования по предметам вступительных экзаменов. **Собеседование** проводится **12 июня**;

— белорусы зарубежья по рекомендациям белорусских организаций или учебных заведений зарубежья на специально выделенные органами управления учебными заведениями места, в рамках контрольных цифр приема.

14. При равенстве конкурсных баллов преимущество имеют:

— инвалиды III группы при отсутствии медицинских противопоказаний;

— лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.19, 20, 23, 24, 25 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС";

— уволенные в запас военнослужащие, имеющие льготы, установленные законодательством, и рекомендации воинских частей;

— лица, имеющие стаж работы не менее двух лет;

| Специальности | Экзамены |
|---|---|
| **Русский язык и литература** | 1. Русский язык (диктант)<br>2. Русский язык и литература (устно)<br>3. Белорусский язык и литература (устно) |
| **Белорусский язык и литература** | 1. Белорусский язык (диктант)<br>2. Белорусский язык и литература (устно)<br>3. Русский язык и литература (устно) |
| **Математика** | 1. Математика (устно)<br>2. Математика (письменно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| **Бухгалтерский учёт, анализ и аудит<br>Экономика и управление на предприятии** | 1. Математика (устно)<br>2. Иностранный язык (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| **Автоматизированные системы обработки информации** | 1. Физика (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| **История** | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Иностранный язык (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| **Правоведение** | 1. Математика (устно)<br>2. Человек и общество (устно)<br>3. Иностранный язык (устно)<br>4. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| **География** | 1. География (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| **Биология** | 1. Биология (устно)<br>2. Химия (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| **Физическая культура и спорт** | 1. Экзамен по спецфизподготовке<br>2. Биология (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |

(ОКОНЧАНИЕ НА 4-Й СТР.)

# “МІСТЭР ГДУ – 2001” – ІГАР БАРСУКОЎ



Хто самы разумны, дасціпны, спрытны, з добрым пачуццём гумару? Гэта па даўняй і добрай традыцыі вызначае універсітэцкі студэнцкі конкурс “Містэр ГДУ”, у якім за права называцца “самым-самым” змагаюцца прадстаўнікі моцнай паловы з усіх факультэтаў.

Не стаў выключэннем і сёлетні год. У напружанай і захапляльнай барацьбе за вышэйшы тытул сапраўднага рыцара, пераадольваючы нялёгкія выпрабаванні разнастайных конкурсных заданняў, да пераможнага фінішу з найбольшай колькасцю балаў дайшоў другакурснік эканомфака Ігар Барсукоў. Яму і было прысуджана ганаровае званне “Містэр ГДУ — 2001”.

**Фота У.Чысціка.**

Канферэнцыі

# З ЗАЯЎКАЙ НА ВЫШЭЙШЫ СТАТУС

Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь сумесна з ГДУ на базе матэматычнага факультэта праведзена традыцыйная, IV-я Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў “Новыя матэматычныя метады і камп’ютэрныя тэхналогіі ў праектаванні, вытворчасці і навуковых даследаваннях”. У ёй прынялі ўдзел 18 ВНУ і арганізацый рэспублікі, і ў тым ліку ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы г.Гомеля.

Працавалі 4 секцыі: “Матэматычнага мадэлявання”, якую ўзначальваў прафесар, д.т.н. І.В.Максімей, “Аўтаматызацыя вытворчых працэсаў” (прафесар, д.т.н. В.В.Мажароўскі), “Аналітычныя і лічбавыя метады даследавання ў матэматыцы” (прафесар, д.ф.-м.н. Ю.У.Малінкоўскі), “Інфармацыйныя тэхналогіі” (к.т.н, дацэнт М.С.Далінскі).

На канферэнцыі было прадстаўлена 176 навуковых дакладаў, найбольшую колькасць з якіх — 51 — падрыхтавалі студэнты і аспіранты нашага універсітэта.

Традыцыйнай канферэнцыі, на якой актыўна абмяркоўваліся новыя аспекты ў навуковых даследаваннях, у будучым плануецца надаць статус міжнароднай. Заяўка на гэта ўжо зроблена сёлета: свае даклады на яе прадстаўлялі Растоўскі дзяржуніверсітэт і Кіеўскі нацыянальны універсітэт.

**А.КАМОРНІКАЎ,**
**член аргкамітэта канферэнцыі, дацэнт.**

# ЁСЦЬ ПУЦЁЎКА НА КУБАК ЕЎРОПЫ!




У г.Брэсце закончыўся чэмпіянат Беларусі па спартыўнай хадзьбе, які з’яўляўся адборачным да Кубка Еўропы, розыгрыш якога адбудзецца ў Славакіі з 25 па 26 красавіка г.г.

Вучань кандыдата педагагічных навук, дацэнта кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Уладзіміра Лемяшкова Сяргей Белуш не толькі заваяваў бронзавы медаль у групе моладзі на дыстанцыі 20 км, але і атрымаў пуцёўку на Кубак Еўропы. Да гэтага трэба дадаць, што Сяргей вучыцца на чацвёртым курсе факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта і яго вынік — 1 гадзіна 26,26 сек. — на дзве з паловай мінуты перавышае нарматыў “Майстар спорту Рэспублікі Беларусь”

Поспехаў табе ў Славакіі, Сяргей!

**В.МАРЧАНКА.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін — асістэнта;

— бухуліку, кантролю і АГД — дацэнта;

— геалогіі і разведкі карысных выкапняў — старшага выкладчыка (0,5 стаўкі);

— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — старшага выкладчыка;

— батанікі і фізіялогіі раслін — прафесара;

— спартыўных дысцыплін — выкладчыка;

— фізвыхавання і спорту — выкладчыка;

— вышэйшай матэматыкі — асістэнта;

— ВМ і праграміравання — дацэнта, асістэнта;

— эканомікі і кіравання вытворчасцю — асістэнта;

— хіміі — асістэнта, старшага выкладчыка;

— грамадзянска-прававых дысцыплін — асістэнта;

— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — асістэнта;

— дыферэнцыяльных ураўненняў — асістэнта;

— давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі — асістэнта;

— оптыкі — дацэнта;

— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — асістэнта (за кошт пазабюджэтнай дзейнасці).

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМ. Ф.СКОРИНЫ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ СТУДЕНТОВ НА I КУРС ЗАОЧНОГО ОТДЕЛЕНИЯ НА 2001 ГОД

(ОКОНЧАНИЕ. НАЧАЛО НА 3-Й СТР.)

— медалисты средних общеобразовательных учебных заведений, отличники средних специальных учебных заведений и ПТУ на основе базовой школы, а также отличники ПТУ на основе средней школы при поступлении на специальности, соответствующие полученным профессиям;

— профессионально ориентированные абитуриенты (закончили факультет довузовской подготовки и профориентации по профилю избранной специальности, имеют стаж работы по специальности, соответствующей избранной, или другую профессиональную ориентацию).

15. Для получения второго высшего образования принимаются лица на условиях полной оплаты обучения. Порядок зачисления этих лиц определяется соответствующим положением.

16. Университет осуществляет прием выпускников Речицкого педагогического колледжа на сокращенный срок обучения по специальности “Белорусский язык и литература” на условиях, определенных учебно-научным объединением согласно действующих нормативно-правовых документов.

17. Все другие вопросы, связанные с приёмом, окончательно решаются приёмной комиссией университета на основе законодательства Республики Беларусь и “Правил приёма в государственные высшие учебные заведения Республики Беларусь на 2001 год”.

18. Документы направлять по адресу: 246019, г. Гомель, ул. Советская, 104, Гомельский госуниверситет им. Ф.Скорины, приёмная комиссия. Телефоны: 56-73-38 (приёмная комиссия), 57-69-17 (ответственный секретарь).

## ЭКЗАМЕН ПО СПЕЦИАЛЬНОЙ ФИЗИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВКЕ

Исходным положением экзаменов по специальной физической подготовке является определение уровня общефизической подготовки и двигательного аппарата абитуриентов.

Сдача экзаменов начинается с дифференцированного зачета по плаванию и при успешной его сдаче абитуриенты продолжают сдавать экзамен по специальной физической подготовке. Он включает нормативы и требования спортивного многоборья, в котором предусмотрено выполнение четырех обязательных видов физических упражнений в соответствии с существующими правилами соревнований.

Результат каждого вида физических упражнений оценивается в зачетных баллах (см.таблицу). В таблице также показаны нормативы и требования к зачету по плаванию. Дистанцию можно проплыть одним из существующих стилей плавания, предусмотренных спортивной классификацией.

Необходимо отметить, что выполнение любого спортивного норматива четырехборья ниже зачетного оценивается двумя (“2”) баллами, которые не являются зачетными и не входят в общую сумму балльной оценки за экзамен.

## КРИТЕРИИ ОЦЕНКИ АБИТУРИЕНТОВ ПО СПЕЦИАЛЬНОЙ ФИЗИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВКЕ

### на вступительных экзаменах в ГГУ им. Ф. Скорины

| № п/п | Виды многоборья | Возраст | Нормативные требования и зачетные баллы | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Мужчины | | | | | Женщины | | | | |
| | | | 5 | 4.5 | 4 | 3.5 | 3 | 5 | 4.5 | 4 | 3.5 | 3 |
| 1 | Бег 100м (сек) | 17-29 | 12.6 | 12.8 | 13.1 | 13.3 | 13.6 | 14.5 | 15.0 | 15.5 | 16.0 | 16.5 |
| | | 30 и более | 13.0 | 13.2 | 13.5 | 13.7 | 14.0 | 15.0 | 15.5 | 16.0 | 16.5 | 17.0 |
| 2 | Бег 1000м (мин, сек) | 17-29 | 3.05 | 3.07 | 3.10 | 3.15 | 3.20 | 3.52 | 4.01 | 4.10 | 4.20 | 4.30 |
| | | 30 и более | 3.15 | 3.20 | 3.25 | 3.30 | 3.35 | 4.10 | 4.20 | 4.30 | 4.45 | 5.00 |
| 3 | Метание гранаты (м) | 17-29 | 48.0 | 46.0 | 44.0 | 41.0 | 38.0 | 32.0 | 30.0 | 27.0 | 25.0 | 22.0 |
| | | 30 и более | 45.0 | 43.0 | 41.0 | 38.0 | 35.0 | 27.0 | 25.0 | 22.0 | 20.0 | 18.0 |
| 4 | Подтягивание в висе на перекладине хватом сверху (кол-во раз) | 17-29 | 16 | 14 | 12 | 10 | 8 | - | - | - | - | - |
| | | 30 и более | 13 | 11 | 9 | 7 | 5 | - | - | - | - | - |
| | Сгибание и разгибание рук в упоре лежа (сгибание рук не менее $90^0$, кол-во раз) | 17-29 | - | - | - | - | - | 28 | 25 | 22 | 18 | 14 |
| | | 30 и более | - | - | - | - | - | 22 | 20 | 18 | 14 | 10 |
| * | *Плавание 100м (мин, сек)* | | | | | | | | | | | |
| – | Вольный стиль | 17-29 | 1.32 | 1.40 | 1.47 | 1.55 | 2.02 | 1.38 | 1.46 | 1.53 | 2.01 | 2.08 |
| | | 30 и более | 1.42 | 1.50 | 1.57 | 2.05 | 2.12 | 1.48 | 1.56 | 2.03 | 2.11 | 2.18 |
| – | Брасс | 17-29 | 1.45 | 1.53 | 2.00 | 2.08 | 2.15 | 2.03 | 2.11 | 2.18 | 2.26 | 2.33 |
| | | 30 и более | 1.55 | 2.03 | 2.10 | 2.18 | 2.25 | 2.13 | 2.21 | 2.28 | 2.36 | 2.43 |
| – | Кроль на спине | 17-29 | 1.45 | 1.53 | 2.00 | 2.08 | 2.15 | 1.53 | 2.01 | 2.08 | 2.16 | 2.23 |
| | | 30 и более | 1.55 | 2.03 | 2.10 | 2.18 | 2.25 | 2.03 | 2.11 | 2.18 | 2.26 | 2.33 |

* - дифференцированный зачет

Таким образом, оценка по специальной физической подготовке состоит из суммы результатов только зачетных баллов, набранных абитуриентом в спортивном многоборье:

От 18 до 20 баллов — 5 (пять)
От 16 до 17 баллов — 4,5 (четыре с половиной)
От 14 до 15 баллов — 4 (четыре)
От 12 до 13 баллов — 3,5 (три с половиной)
От 10 до 11 баллов — 3 (три)

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб’ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 204
Падпісана да друку 6.04.2001 г.